**Аб** нашых земляках // Ленінская іскра (Сянно). — 1988. — 25 жн. — С. 2.

# АБ НАШЫХ ЗЕМЛЯКАХ



На сустрэчу воінаў-інтэрнацыяналістаў, якая праходзіла ў зале пасяджэнняў райкама КПБ, у вайсковай форме прыйшоў толькі адзін Аляксандр Бобрык. Яго грудзі ўпрыгожвалі баявыя ўзнагароды. Так, так, баявыя. За мужнасць і гераізм, праяўленыя пры выкананні інтэрнацыянальнага абавязку ў Афганістане, Аляксандр узнагароджаны медалямі «Воіну-інтэрнацыяналісту ад удзячнага афганскага народа», «За самаадданую ратную працу» і «70 год Узброеным Сілам СССР». Ёсць што расказаць быламу воіну сваім аднагодкам, малодшым таварышам. Не з лёгкіх была служба. Але добрая загартоўка, мужнасць і гераізм дапамаглі перанесці ўсе цяжкасці службы.

Цяпер Аляксандр Бобрык жыве ў пасёлку Дружба. Сваім абавязкам ён лічыць весці ваенна-патрыятычную работу сярод моладзі Сенненшчыны. Яго біяграфія – гэта канкрэтны прыклад адданасці нашай Радзіме, прыклад узорнага выканання інтэрнацыянальнага абавязку ў дружалюбнай краіне.

На здымку: воін-інтэрнацыяналіст Аляксандр Бобрык

Фота У. Мірзы